**КУРСАВАЯ ПРАЦА** – адно з найбольш пашыраных вучэбна-даследчыцкіх заданняў у вышэйшых навучальных установах.

У адпаведнасці з вучэбным планам студэнты філалагічных факультэтаў класічных і педагагічных універсітэтаў Беларусі (спецыяльнасць 1–02 03 01) на пятым годзе навучання пішуць курсавыя працы па методыцы выкладання беларускай літаратуры. Студэнцкая навуковая праца па методыцы мае сваю адметнасць. Яна зводзіцца да таго, што зместам многіх курсавых прац па методыцы, часткова або поўнасцю, павінен быць аналіз вопыту выкладання беларускай літаратуры, вядомага студэнтам па назіраннях, або асабістага вопыту (эксперыменту), набытага ў часе педагагічнай практыкі. Выкананне працы па методыцы садзейнічае глыбокаму засваенню тэорыі прадмета, развіццю даследчыцкіх навыкаў студэнтаў, далучэнню іх да метадычнай творчасці, знаёмству са штодзённай працай настаўніка.

Парадак выканання курсавой працы наступны. Улічыўшы асабістую зацікаўленасць і парады навуковага кіраўніка, студэнт выбірае тэму даследавання і складае бібліяграфію, у якую пры неабходнасці могуць быць унесены падручнікі па методыцы і асноўныя вучэбныя і метадычныя дапаможнікі.

Пры вывучэнні літаратуры найбольш цікавыя думкі канспектуюцца, а самыя важныя дакладна цытуюцца з поўнай пашпартызацыяй.

Наступны этап працы – азнаямленне са школьнай дакументацыяй (планы і канспекты ўрокаў, пазакласных і пазашкольных мерапрыемстваў, пратаколы пасяджэнняў педсавета і метадычных секцый, вучнёўскія чытацкія фармуляры, сачыненні па літаратуры), аналіз школьных падручнікаў і праграм, распрацоўка плана правядзення эксперыменту.

Пры збіранні матэрыялу студэнт падрабязна запісвае ход праведзеных самім або настаўнікам урокаў (мерапрыемстваў), робіць іх аналіз. Сабраны матэрыял апрацоўваецца і сістэматызуецца, але папярэдне складаецца план працы, які ў працэсе яе выканання можна ўдакладняць.

Ва ўступе пры неабходнасці асвятляецца гісторыя пытання, даецца агляд літаратуры, вызначаюцца мэты і задачы даследавання. Асноўная частка можа мець некалькі раздзелаў. У ёй паслядоўна выкладаюцца асноўныя тэарэтычныя палажэнні, якія пацвярджаюцца адказамі вучняў, вытрымкамі з іх сачыненняў, фрагментамі ўрокаў, лічбавымі дадзенымі. У заключэнні аўтар робіць вывады, падводзіць вынікі праведзенага даследавання.

Пры напісанні курсавой працы ў шматлікіх выпадках прадугледжана складанне канспектаў урокаў або пазакласных ці пазашкольных мерапрыемстваў. Пры гэтым неабходна дакладна сфармуляваць тэму, вызначыць навучальна-выхаваўчыя задачы, пералічыць абсталяванне, апісаць ход урока (мерапрыемства), назваўшы асноўныя навучальныя метады і прыёмы. Лекцыя (слова) настаўніка перадаецца даслоўна, гутарка – у выглядзе сістэмы пытанняў і заданняў. Пры складанні плана (канспекта) урока вызначаецца тып або від урока.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ